## *НАШИ ЮБИЛЯРЫ*

### АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ ДАНІЛАЎ. ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ



14 мая 2025 года споўнілася 70 гадоў вядомаму беларускаму сацыёлагу, загадчыку кафедры сацыялогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, члену-карэспандэнту Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктару сацыялагічных навук, прафесару Аляксандру Мікалаевічу Данілаву.

Нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч у Віцебску, дзе атрымаў сярэднюю, а потым і вышэйшую адукацыю (у Віцебскім ветэрынарным інстытуце). Тэрміновую ваенную службу праходзіў у войсках стратэгічнага прызначэння. Працоўную дзейнасць пачаў яшчэ ў студэнцкія гады, на выбарных пасадах у камітэце камсамола ВНУ, Віцебскім абкаме і ЦК ЛКСМ Беларусі. Менавіта ў маладзёжным асяроддзі пачаўся шлях А. М. Данілава ў сацыялагічную навуку: з 1978 г. працуючы ў камсамольскіх органах, яму давялося ўзначальваць аддзелы студэнцкай моладзі абкама і ЦК, лектарскую групу ЦК камсамола, па яго ініцыятыве была створана сацыялагічная лабараторыя пры ЦК ЛКСМ Беларусі. Таму цалкам абгрунтаванай будзе наступная выснова: Аляксандр Мікалаевіч – сацыёлаг па прызванні і па жыцці: да абароны ў 1990 г. кандыдацкай дысертацыі на тэму «Сацыялагічны аналіз духоўных патрэбнасцей моладзі (па матэрыялах Беларускай ССР)» ён ужо меў за плячыма немалы вопыт даследніцкай працы, каардынаваў дзейнасць Савета па даследаванні праблем моладзі пры ЦК ЛКСМ Беларусі, шмат публікаваўся ў рэспубліканскім друку, навуковых выданнях.

У 1991 г. А. М. Данілаву прапанавалі стварыць сектар вывучэння грамадскай думкі і прагназавання ў Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, якім ён загадваў больш за тры гады. З першых дзён стварэння Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (1994 г.) Аляксандр Мікалаевіч працуе загадчыкам сектара, намеснікам начальніка Галоўнага ўпраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі – начальнікам інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з 2000 г. – прафесарам кафедры сацыялогіі БДУ, у 2003–2016 гг. – намеснікам старшыні ВАКа Рэспублікі Беларусь, які курыраваў пытанні атэстацыі кадраў па гуманітарных і сацыяльных навуках.

Сваю працу ў органах дзяржаўнага кіравання Беларусі А. М. Данілаў заўсёды дапаўняў самаадданым служэннем сацыялагічнай навуцы. У 1993 г. ён абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Моладзь Рэспублікі Беларусь ва ўмовах пераходу да рынкавых адносін (метадалагічны аспект)». З 2005 г. Аляксандр Мікалаевіч з'яўляецца загадчыкам кафедры сацыялогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ён выдаў шэраг грунтоўных манаграфій: «Пераходны працэс і моладзь» (1993); «Пераходнае грамадства: праблемы сістэмнай трансфармацыі» (1997, 1998); «Улада і грамадства: пошук новай гармоніі» (1998); «Моладзь крызісных гадоў: ілюзіі і новыя надзеі» (1999); «Сацыялогія ўлады: тэорыя і практыка глабалізму» (2001); «Перадгісторыя сацыялогіі» (2009, у суаўтарстве з А. М. Елсуковым). Заснаваў серыю кніг «Кафедра сацыялогіі» і асабіста ўдзельнічаў ў напісанні шэрага навучальных дапаможнікаў: «Гісторыя сацыялогіі» і «Асновы сацыялогіі і паліталогіі» (2012, у суаўтарстве з А. М. Елсуковым); «Сацыялогія палітыкі» (2013, у суаўтарстве з Ж. М. Грышчанка), трох выданняў навучальнага дапаможніка «Сацыялогія» і многіх іншых кніг навучальнага кірунку (усяго апублікавана каля 300 навуковых прац).

Выключная працавітасць А. М. Данілава, яго навукова-арганізацыйны талент прынеслі яму прызнанне ў беларускай навуковай супольнасці: у 1996 г. ён абраны членам-карэспандэнтам НАН Беларусі і намеснікам старшыні Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў; у 1997 г. ён становіцца галоўным рэдактарам заснаванага ім навукова-тэарэтычнага часопіса «Сацыялогія», а таксама два тэрміны запар займае на грамадскіх пачатках пасаду намесніка акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі; у 1999 г. атрымлівае прэмію НАН Беларусі за лепшую навуковую працу; у 2000 г. выбіраецца старшынёй Беларускага грамадскага аб'яднання «Сацыялагічнае таварыства»; у 2001 г. яму прысуджаецца стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за дасягненне высокіх вынікаў у сферы прафесійнай дзейнасці; у 2005 г. аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за заслугі ў фарміраванні нацыянальнай сістэмы атэстацыі, плённую працу ў галіне падрыхтоўкі і атэстацыі навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

Сёння можна з упэўненасцю сцвярджаць, што за два дзесяцігоддзі сваёй працы на пасадзе загадчыка кафедры сацыялогіі БДУ А. М. Данілаву ўдалося галоўнае – сцвердзіць яе пазіцыі як вядучага адукацыйна-навуковага сацыялагічнага падраздзялення ў краіне. Зрабіць гэта ў наш няпросты час рэфармавання сістэмы адукацыі было вельмі складанай справай. Неабходна прызнаць, што шмат у чым гэта ўдалося дзякуючы асабістаму прыкладу паўсядзённай дзелавой актыўнасці загадчыка кафедры, які пастаянна генерыруе новыя навуковыя і педагагічныя ідэі, што і дазволіла падвоіць творчы патэнцыял калектыву кафедры і кожнага яе выкладчыка паасобку.

Па ініцыятыве А. М. Данілава, пад яго рэдакцыяй альбо з яго прадмовай пабачылі свет такія арыгінальныя працы, як «Сацыялагічная энцыклапедыя»

(2003); «Грамадская місія сацыялогіі» С. А. Шавеля (2010); «Сацыялогія як лёс: выбранае» Л. Г. Новікавай (2012); «Праблемы фарміравання беларускай дзяржаўнасці ў ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя: выбраныя працы М. С. Сташкевіча» (2012); «Дэмаграфічныя рытмы і перамены: да пазнання беларускага соцыуму: выбранае» А. А. Ракава (2014); «Сінтэз філасофіі, навукі, культуры. Да 80-годдзя акадэміка В. С. Сцёпіна» (2014); «Сучасны соцыум у свеце глабальных змен: да 85-годдзя акадэміка Я. М. Бабосава» (2016); «Сацыясферная стратэгія развіцця грамадства» С. А. Шавеля (2022); «Эпоха акадэміка В. С. Сцёпіна» (2024); «Сацыёлаг С. А. Шавель. Шляхі да тайнаў быцця» (2025) і інш. Гэта цудоўная здольнасць А. М. Данілава – прызнаць талент іншага чалавека, без зайздрасці і крывадушнасці прыцягнуць увагу грамадскасці да таго лепшага, што створана іншымі і што па праве павінна захавацца ў сучасным навуковым кантэксце як наша агульная спадчына. Хіба гэта не высакародная місія Чалавека неабыякавага, які бескарысна папулярызуе ідэі калег са свайго гуманітарнага цэха? Тым больш, што частка з іх ужо пайшла з гэтага жыцця.

Аляксандр Мікалаевіч – аўтар дзясяткаў разгорнутых біяграфічных нарысаў і эсэ пра беларускіх вучоных і дзеячаў культуры. Частка гэтых нарысаў і эсэ ўвайшла ў кнігу «Слова аб сучасніках: эсэ, інтэрв'ю» (2013), якая выклікала вялікую цікавасць у навуковай грамадскасці Беларусі. Больш таго, гэта кніга стала для многіх чытачоў сапраўдным адкрыццём, раскрыўшым маральнае крэда самога аўтара, здольнага зразумець і ацаніць асобу безадносна да яе фармальна-статусных характарыстык.

Намаганнямі юбіляра арганізуюцца і праводзяцца шматлікія сацыялагічныя і іншыя навуковыя канферэнцыі, сустрэчы навуковай грамадскасці з выдатнымі расійскімі вучонымі (акадэмікамі В. С. Сцёпіным, А. А. Гусейнавым, У. А. Лекторскім, членамі-карэспандэнтамі Р. С. Грынбергам, У. В. Міронавым, Ж. Ц. Тошчанкам і інш.). У час імклівых перамен, калі рвуцца існуючыя навуковыя і іншыя сувязі, такія сустрэчы ўводзяць прысутных у атмасферу аднароднай дыялогавай прасторы, дапамагаючы не проста зразумець адзін аднаго, але і інтэграваць намаганні ў напрамку асэнсавання праблем сучаснага светапогляду, які зараз імкліва трансфармуецца.

Сёння А. М. Данілаў – не толькі бясспрэчны аўтарытэт у галіне тэорыі, метадалогіі і гісторыі сацыялогіі, сацыялогіі трансфармацыйных працэсаў у пераходных грамадствах, сацыялогіі ўлады, сацыялогіі моладзі і сацыялогіі навукі, але і яскравы жыццёвы прыклад для навуковай моладзі. Аляксандру Мікалаевічу ёсць чым ганарыцца: у 38 гадоў ён – доктар навук, у 41 год – член-карэспандэнт НАН Беларусі, у 70 гадоў – сапраўдны мэтр акадэмічнай і вузаўскай навукі, пад умелым кіраўніцтвам якога абаронены некалькі дзясяткаў доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Галоўнае ж – ён заўсёды акружаны людзьмі, якія цягнуцца да яго як да эпіцэнтра сацыяльнага аптымізму і жыццёвай энергетыкі. А яшчэ Аляксандр Мікалаевіч – шчаслівы бацька, які разам са сваёй жонкай Людмілай Уладзіміраўнай выхаваў цудоўных дзяцей – дачку Кацярыну, кандыдата сацыялагічных навук, і сына Антона.

Пажадаем жа нашаму дарагому юбіляру і далей заставацца такой жа шматграннай асобай, што плённа працуе на педагагічнай і навуковай ніве, зараджаным на выніковыя даследаванні сацыёлагам, цудоўным арганізатарам навукі, удумлівым педагогам! Мы верым у яго сумленнасць і прынцыповасць, у яго талент і моц духа, у яго неадольнае жаданне славіць друкаваным словам людзей працы і ведаў. Моцы, здароўя і доўгіх гадоў жыцця табе, дарагі сябар! Няхай збудуцца ўсе твае самыя смелыя планы і мары!

Я. М. БАБОСАЎ,
*акадэмік НАН Беларусі, доктар філасофскіх навук, прафесар*

П. А. ВАДАП'ЯНАЎ,
*член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філасофскіх навук, прафесар*

А. А. КАВАЛЕНЯ,
*акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар*

М. Л. МЫСЛІВЕЦ,
*кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт*

В. К. ШЧЭРБІН,
*кандыдат філалагічных навук*

*Паступіла 10.04.2025 г.*